**Алімпіядныя заданні для 6 класа**

1. **Згрупуйце словы па колькасці гукаў у канчатках: армія, бярозавая, вясенняя, гуляю, дом, дрэва, лес, мара, печ, працую, сабака, сіняга жыццё, лесвіца, старасць.**
2. **Запішыце з дадзеных толькі тыя словы, у якіх колькасць гукаў і літар не супадае: адзвінець, барацьба, дзераза, дождж, дзянёк, заціхаць, капвюць, люблю, людзі, месячны, мерыдыян, надвор'е, павільён, пераезд, пяхота, п'яўка, рабіна, салаўі, удзячны, уюн.**
3. **Назоўнік *зямля* ў беларускай мове мае шэсць значэнняў. Растлумачце іх.**
4. **Падкрэсліце словы, якія маюць пераноснае значэнне. З якой мэтай яны ўжыты ў вершы?**

**Пышна залоціцца рослае жыта,**
**Морам хвалюецца дол.**
**Гоман і шум на калгасных загонах;**
**Праца кіпіць навакол…**
**Вось і камбайн падкаціў на загоны.**
**Праца на полі спарней:**
**Жне і малоціць машына імклівa,**
**Цешыць працоўных людзей. ( Я. Журба)**

**5.Выпішыце з тэксту назоўнікі 2-га скланення і пастаўце іх у родным склоне адзіночнага ліку.**

**Мова продкаў нашых і нашчадкаў,**
**Шэпт дубровы і пчаліны звон,**
**Нам цябе ласкава іашчадна**
**Спазнаваць ажно да скону дзён,**
**Па чужых краях не пабірацца,**
**Не аддаць цябе на забыццё,**
**Наша невычэрпнае багацце,**
**Наша несмяротнае жыццё.**

6. **Вызначце, якую сінтаксічную ролю выконваюць у сказах прыметнікі.**

**Свая салома мякчэй чужой пярыны. 2. Хоць мал гаршчок, ды кашу варыць. 3. Мыла чорна, ды мые бела. 4. Новае сітца на калочку вісіць, а старое пад лаўкай ляжыць. 5. Найсмачнейшы хлеб ад сваёй працы.**

7. **Запішыце лічбы словамі: каля 117 кг, звыш 1379т, у 395 пакетах.**

8. **Якія агульныя і адметныя граматычныя прыметы маюць словы, запісаныя ў слупках?**

| | |
|---|---|
| ціхі | луг |
| добры | грыб |
| нізкі | дзень |
| белы | дом |
| стары | год |